# Калейдаскоп

снежань 2019

**Школьная газета №4(14)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*



# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**снежань 2019**

**Сяргей Грахоўскі**
**Каля вогнішча**

Над восеньскім полем адзіная зорка
То знікне, то зноў задрыжыць угары.
Павеяла дымам вільготным і горкім
З кастра, што, відаць, дагарэў без пары.
Знаёмыя пахі сатлелай ігліцы
Я прагна ў абветраным полі лаўлю
І мару, – да вогнішча б мне прытуліцца,
Іскрынку б знайсці, – я агонь распалю.
Знайшоў і з-пад прысака выграб жарынку,
Дыханнем яе у далонях сагрэў,
Падкінуў ігліцы, і цераз хвілінку,
Як znічка, агеньчык дрыжаў і гарэў.
Я ўкленчыў прад ім, нібы вогнепаклоннік,
Прасіў не патухнуць, ажыць і гарэць.
Дрыжаў язычок, і зялёненькі конік
Да вогнішча выскачыў лапкі пагрэць.
Агонь зашугаў, затрашчала ламачча,
Гарачыя іскры ляцелі да зор...
У полі асеннім – такая удача –
Знайсці і раскласці з іскрынкі касцёр.
Таму не было мне і ў змроку трывожна,
Хоць нейчыя крокі пачуў за спіной:
Да вогнішча з поля прыйшоў падарожны,
І мы гаварылі на мове адной.
Ігліца трашчала, ламачча гарэла,
Асеннія ветры свісталі ўвушшу.
Мне рукі азяблыя полымя грэла,
А роднае слова сагрэла душу.



## 85 год з дня нараджэння Івана Чыгрынава

Празаік, драматург, перакладчык, літаратурны крытык, публіцыст. Народны пісьменнік Беларусі (1994). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1974), Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1979). Ганаровы грамадзянін г. Касцюковічы (1992). Ганаровы доктар БДУ (1995). Выпускнік аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ (1957).

Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў нарадзіўся 21 снежня 1934 г. у вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1952 г. скончыў Саматэвіцкую сярэднюю школу і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля заканчэння ўніверсітэта (1957) працаваў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі літаратуры і мастацтва ў выдавецтве Акадэміі навук БССР. У 1965—1975 гг. — рэдактар аддзела публіцыстыкі і нарыса ў часопісе «Полымя». З 1975 г. намеснік старшыні, а ў 1976—1986 гг. — сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. З 1987 па 1996 г. — старшыня Беларускага фонду культуры. У 1989—1996 гг. — галоўны рэдактар часопіса «Спадчына». Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1986—1990), старшыня пастаяннай камісіі па нацыянальных пытаннях і міжнародных адносінах (1988—1990). У 1978 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у 33-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН. Памёр 5 студзеня 1996 г., пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. У 1952 г. дэбютаваў вершамі, у 1957 г. надрукаваў першы празаічны твор у газеце «Чырвоная змена». Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Птушкі ляцяць на волю» (1965), «Самы шчаслівы чалавек» (1967), «Ішоў на вайну чалавек» (1973), «Ці бываюць у выраі ластаўкі?» (1983). Стварыў цыкл раманаў «Плач перапёлкі» (1972), «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужынцы» (1984), «Вяртанне да віны» (1992), «Не ўсе мы згінем» (1996). Пенталогія (верамейскаўская хроніка) склала аднатомнік «Выбраныя творы» (2008). Напісаў п'есы «Следчая справа Вашчылы», «Чалавек з мядзведжым тварам», «Звон — не малітва» (усе — 1988), «Толькі мёртвыя не вяртаюцца», «Ігракі» (абедзве — 1989), «Прымак», «Савіцкі» (абедзве — 1994) і інш. Стварыў п'есы паводле ўласных твораў «Плач перапёлкі» (паст. у 1980), «Апраўданне крыві» (паст. у 1984), «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» (паст. у 1986). Выдаў кнігі крытыкі і публіцыстыкі «Новае ў жыцці, новае ў літаратуры» (1983), «Паміж сонцам і месяцам» (1994). Напісаў асобныя раздзелы манаграфіі «Н. Я. Никофоровский » (1960). Суаўтар сцэнарыя шматсерыйнага тэлефільма «Руіны страляюць…» (1973). Паводле раманнага эпасу пісьменніка зняты шматсерыйны фільм «Плач перапёлкі» (1990). Па матывах рамана «Плач перапёлкі» У. Кандрусевіч напісаў аднайменную сімфонію. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, медалём Ф. Скарыны. Імя Івана Чыгрынава прысвоена вуліцы ў Магілёве, Касцюковіцкай раённай бібліятэцы, у Мінску на доме № 29 па вуліцы Пуліхава, у якім жыў народны пісьменнік, у Магілёве на будынку сярэдняй школы № 6 па вуліцы Івана Чыгрынава ўсталяваны мемарыяльныя дошкі.

# Папулярызацыя беларускай мовы



**«Хто хоча стаць знатаком?»**

**12 снежня** каманды вучняў **6 “А”** і **6 “В”** класаў прынялі ўдзел у гульні **“Хто хоча стаць знатаком? ”**. Дзеці спаборнічалі ў розных конкурсах па беларускай мове і літаратуры. Знаходзілі рашэнне для моўных прапорцый, былі рэжысёрамі ў конкурсе “Кінастужка”. Вучням было цікава даведацца, хто такі паліглоці, што спачатку насоўка мела назву “сударый”. А фразеалагізмы былі нечым інтрыгуючым. І нікому не хацелася апусціць рукі, вадзіць сябра за нос, а вельмі хацелася насіць на руках і трымаць вуха востра.

Разумець адзін аднаго, правільна запісваць словы і ўмець растлумачыць значэнні слоў аказалася простым, карысным, пазнавальным і цікавым заняткам. Сустрэча прынесла задавальненне ўсім удзельнікам.

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Т.М. Лістраценка








# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2019**

---

**Конкурс “Сузор’е талентаў”**

**19 снежня** для вучняў **7 “В”** класа прайшоў конкурс **“Сузор’е талентаў”.**

Усе ўдзельнікі выступалі са сваімі нумарамі: чыталі на памяць вершы, празаічныя творы, распавядалі займальныя гісторыі, спявалі песні, ілюстравалі малюнкі да прачытаных твораў. Конкурс атрымаўся цікавым і пазнавальным. Пераможцы атрымалі ўзнагароды.

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры С. А. Юрчанка





# Літаратурная старонка





## Якуб Колас
## Дзед Мароз

**Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам.
Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай посцілкай-кажухам.
Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.
А ялінка!.. Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.
Тут лісічка, зайчык, мышка,
Рыбкі, буслік доўгавязы.
А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гараць алмазы!
Каля ёлкі карагоды,
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусы смех пускае.
Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.**

## Традыцыі Новага года

**Традыцыя адзначаць пачатак новага каляндарнага года існуе практычна ва ўсім свеце. Мы прыход новага года адзначаем 1 студзеня, хоць яшчэ з дахрысціянскіх часоў для нашых продкаў галоўнымі зімовымі святамі былі Каляды, цесна звязаныя з днём зімовага сонцастаяння.**

**Елка прыйшла ў XIX стагоддзі**

Ужо пазней, з прыняццем хрысціянства, язычніцкае свята ператварылася ў свята Раства Хрыстова. Вобраз калядняй елкі, якая прыйшла ў хаты нашых продкаў у XIX стагоддзі, добра ўпісаўся ў хрысціянскую традыцыю: упрыгажэнні і ласункі сімвалізавалі дары, прынесеныя маленькаму Хрысту, а свечкі нагадвалі асвятленне месца, у якім спынялася Святое Сямейства на шляху ў Віфлеем.

Да таго ж на верхавіну дрэва заўсёды вешалі ўпрыгажэнне, якое сімвалізавала Віфлеемскую зорку, якая ўзышла ў час нараджэння Ісуса і паказала дарогу вешчунам. У выніку елка стала сімвалам Калядаў.

**Да Калядаў рыхтаваліся сур'ёзна**

За стагоддзі язычніцкія і хрысціянскія традыцыі перапляліся настолькі моцна, што сёння яны проста непадзельныя.

Рыхтаваліся да Калядаў сур'ёзна і загадзя. Напярэдадні свята калолі кабанчыка, нават у небагатых сем'ях, і яшчэ да пачатку свята стараліся скончыць усе работы з мясам. Сустракаць гэтае свята трэба было чыстым, таму абавязкова старанна прыбіралі ў хаце, у двары, затым самі мыліся ў лазні, апраналі, па магчымасці, новую вопратку.

**Прыкметы і абрады**

Рытуалы і традыцыі свята заўсёды дакладна выконваліся.

Лічылася, што ў гэты вечар можна нават паўплываць на жыццё-быццё ў будучым годзе: ножкі каляднага стала "спутвалі" вяроўкай, каб не ўцякала са статку і не гінула жывёла, каб коні і валы былі моцнымі. Тры абрадавых вячэры на працягу Каляд, а часам і самі вечары, называліся куццямі.

**Першая лыжка – "дзядам"**

Увесь вечар напярэдадні Калядаў людзі трымалі шчыры пост, і толькі пасля з'яўлення першай зоркі на небе садзіліся за стол. Гэтая куцця была посная – на стол збіраліся толькі посныя стравы, пажадана 12. На стале было разаслана свежае сена (каб у новым годзе быў добры ўраджай), на яго засцілалі чысты абрус.

Галоўнай стравай на святочным стале была куцця – каша, якую рыхтавалі з ячменю або пшаніцы і засалоджвалі мёдам. Гаспадыня ставіла на сярэдзіну стала куццю са свечкай і бліны – сімвал Сонца. Гаспадар запальваў свечку, чытаў малітву, затым ставіў свечку ў чырвоны кут і першым садзіўся за стол.

Лічылася, што ў гэты вечар на вячэры нябачна прысутнічаюць душы памерлых продкаў, таму перш чым прыступіць да ежы, першую лыжку кашы ў сподку клалі на парог або на падаконнік – "дзядам".

Часам на акенца адпраўлялася і другая лыжка кашы – для марозу, каб прыходзіў зімой і не марозіў пасевы па вясне. Пасля гэтага дамачадцы дзялілі астатнюю куццю на ўсіх і далей частаваліся аўсяным кісялём, грыбамі, блінамі, прычым верхні блін здымалі і хавалі, каб накарміць ім скаціну ў Вадохрышча (каб не хварэла). За сталом усім трэба было абавязкова паспрабаваць хоць патроху ад кожнай стравы.

# Цікава ведаць



**Традыцыі Новага года**

**Святкавалі цэлы тыдзень**

На Каляды стараліся падняцца на світанку, лічылася, хто ў гэты дзень устане раней, у таго круглы год уся праца будзе добра ладзіцца. Пасля святочнай службы ў храме і разгавення пачыналі па-сапраўднаму святкаваць Каляды, якія доўжыліся цэлы тыдзень (да Шчодрыка), – наступалі святыя вечары, або святкі, што заканчваліся ў дзень Вадохрышча.

У першы калядны дзень было прынята наведваць сваіх хроснікаў, дарыць ім падарункі.

Увечары была багатая, шчодрая куцця – каша на сале або масле, побач з якой на стол выстаўляліся вельмі сытныя, галоўным чынам мясныя стравы (каб год наступіў багаты і ўсяго прынёс у дастатку): запечанае парася, каўбасы, дзічына, бліны і пірагі з рознымі начынкамі, гусь з яблыкамі, смажаная рыба ды іншыя прысмакі.

**Калядоўшчыкі – самыя дарагія госці**

Днём дзеці хадзілі з песнямі па вуліцах “славіць Хрыста” і атрымлівалі за гэта манеткі і ласункі. А ўвечары наступаў час моладзі – пара калядавання. Вялікія кампаніі па 10–15 чалавек пераапраналіся ў цыган, у мядзведзяў, абавязкова ўбіралі аднаго з членаў групы казой – апраналі на яго вывернуты поўсцю ўверх кажух, прымацоўвалі “рогі”. Майстравалі вялікую зорку, якую насілі потым на шчасце.

Падчас калядных святаў абавязкова трэба было весяліцца, а таму калядоўшчыкі і музыкі былі самымі дарагімі і ганаровымі гасцямі ў кожнай хаце. Калядоўшчыкі спявалі песні, прыпеўкі, танцавалі, славілі гаспадара дома і яго сям’ю. За гэта іх адорвалі смачнай ежай са святочнага стала і дробнымі грашыма, прычым падарункі гэтыя падаваліся не як міласціна жабракам, а як даніна, якая па праве належыць калядоўшчыкам.

**Варажба – абавязковы элемент свята**

Са старажытнасці абавязковым атрыбутам калядных святаў была варажба, якая пачыналася ўвечары напярэдадні Калядаў і працягвалася да Шчодрыка. Асабліва гэты занятак любілі дзяўчаты, якія марылі зазірнуць у сваю будучыню.

Варажылі да самага Вадохрышча, напярэдадні якога праўлялася трэцяя куцця, так званая галодная. На стале ў гэты вечар было няшмат страў, а сама вячэра была нядоўгай. Лічылася, што ў гэты раз з ежай трэба ўправіцца хутчэй, каб і летам усе працы ў полі хутка скончыць. Гаспадар дома ў гэты вечар выходзіў на двор і мелам маляваў крыжы над усімі варотамі, вокнамі і дзвярыма, каб абараніць свой дом і сваю гаспадарку ад нячыстай сілы.

**Як святкавалі ў гарадах**

У гарадах Расійскай Імперыі ў XIX стагоддзі святкаванне адрознівалася ад сельскага. Было прынята ўладкоўваць калядныя гулянні, кірмашы, цырк-звярынец, латарэі, феерверкі. Для багатых гараджан праводзіліся балі, маскарады і танцавальныя вечары.

У вялікіх і малых гарадах і мястэчках карысталіся нязменным поспехам прадстаўленні народнага лялечнага тэатра – батлейкі.

Нумар падрыхтавалі: Краўцоў Ягор (11 “А”),
Кудраўцаў Алег (11 “А”),
Мартынава Яна (11 “А”),
Молакава Вікторыя (11 “А”),
Пратасава Кацярына (11 “А”).
Рэдактар Юрчанка С. А.

